Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

Брестская епархия Белорусской православной церкви

Кафедра истории культуры и религии

# ПРАВОСЛАВИЕ В ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ БЕЛАРУСИ

БрГУ имени А.С. Пушкина
2008

**Учреждение образования**
**«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»**

**Брестская епархия Белорусской православной церкви**

**Кафедра истории культуры и религии**

# ПРАВОСЛАВИЕ В ДУХОВНОЙ ЖИЗНИ БЕЛАРУСИ

Сборник материалов
международной научно-практической конференции

25–26 апреля 2007 года

**БрГУ имени А.С. Пушкина**
**2008**

УДК 281.9(476)(063)
ББК 86.372
П68

*Рекомендовано редакционно-издательским советом*
*учреждения образования*
*«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Рецензенты:*

доктор исторических наук, профессор
**В.И. Новицкий**

доктор исторических наук, профессор
**М.В. Стрелец**

*Редакционная коллегия:*

доктор исторических наук, профессор **М.Э. Чесновский**
доктор исторических наук, профессор **А.А. Горбацкий**
кандидат исторических наук, доцент **А.Н. Вабищевич**

**Православие** в духовной жизни Беларуси : сб. материалов между-
П68 нар. науч.-практ. конф., Брест, 25–26 апр. 2007 г. / [редкол.: М. Э. Чесновский, А. А. Горбацкий, А. Н. Вабищевич] ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; Брест. епархия Белорус. православ. церкви ; Каф. истории культуры и религии. – Брест : Изд-во БрГУ, 2008. – 295 с.
ISBN 978-985-473-301-2.

В сборник включены доклады и сообщения международной научно-практической конференции «Православие в духовной жизни Беларуси», которая состоялась в Бресте 25–26 апреля 2007 года. Организаторами конференции являлись кафедра истории культуры и религии БрГУ имени А.С. Пушкина и Брестская епархия Белорусской православной церкви.

Адресуется ученым, священнослужителям, работникам органов государственного управления, учреждений образования и культуры, студентам, школьникам и всем, кого интересуют проблемы православной церкви, ее место и роль в сохранении и приумножении материального и духовного наследия Беларуси.

**УДК 281.9(476)(063**
**ББК 86.372**

**ISBN 978-985-473-301-2**
© БрГУ имени А.С. Пушкина, 2008

ходимо отличать образ «Живоначальной Троицы» от извода «Гостеприимства Авраама». Схема А. Рублева не получила в рассматриваемый период распространения в белорусской иконописи, все названные нами белорусские иконы принадлежат именно к древнему изводу «Гостеприимства Авраама». Развивая эту иконографическую схему, белорусские мастера использовали ренессансные и барочные пластические средства, характерные для белорусского искусства XVII–XVIII вв. Это отличает их от древнерусских образов данного типа и говорит о самобытности белорусских произведений.

## СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ

1. Кондаков, Н. П. Лицевой иконописный подлинник. Иконография Господа Бога и Спаса нашего Иисуса Христа. – СПб., 1905. – Т. 1. – 220 с.

2. Высоцкая, Н. Ф. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стст. : альбом. – Мінск, 1998. – 232 с.

3. Пискун, Ю. А. На перекрестке Европейских дорог: белорусские иконы. – Милан, 2006.

4. Ульянов, О. Г. «Филоксения Авраама»: библейская святыня и догматический образ // Богословские труды. – М., 1999. – Т. 35. – 340 с.

5. Философия русского религиозного искусства XVI–XX вв. : антология / сост. Н. К. Гаврюшин. – М., 1993. – 399 с.

6. Флоренский, П., свящ. У водоразделов мысли. Статьи по искусству. – Париж, 1985.

7. Языкова, И. К. Богословие иконы. – М., 1994. – 212 с.

УДК 271.2(091)(476)

**А.М. Вабішчэвіч (Брэст)**

## ПАЛАНІЗАЦЫЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-х гг.: ПЛАНЫ І ПРАКТЫЧНАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ

Становішча праваслаўнай царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі ў склад Польшчы, было даволі супярэчлівым. З аднаго боку, Польскі ўрад імкнуўся да вызвалення яе ад падпарадкавання Маскоўскаму Патрыярхату. 14 чэрвеня 1922 г. на саборы епіскапаў у Варшаве было прынята рашэнне аб аўтакефаліі праваслаўнай царквы ў Польшчы. Супраць гэтага выступілі кіраўнікі ўсіх трох заходнебеларускіх епархій – Віленскай, Гродзенскай

і Пінскай. Іх падтрымалі свяшчэннікі, якія прыехалі раней з Расіі, частка клірыкаў-беларусаў. Менавіта з санкцыі дзяржаўных польскіх улад былі разгорнуты ганенні супраць іерархаў праваслаўнай царквы, што не пагаджаліся з аўтакефаліяй. Працэс урэгулявання прававога становішча праваслаўнай царквы расцягнуўся на ўвесь міжваенны час. Толькі 18 лістапада 1938 г. замест «Часовых правілаў» 1922 г. быў падпісаны «Унутраны статут» праваслаўнай царквы ў Польшчы, які фактычна замацаваў яе поўнае падпарадкаванне дзяржаве [1, с. 114–127].

З другога боку, дзяржаўныя ўлады Польшчы імкнуліся прыцягнуць праваслаўную царкву да рэалізацыі планаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва, узмацнення экспансіі польскай культуры, асабліва з сярэдзіны 1930-х гг. [2, с. 209]. Паводле асобных звестак, у студзені 1935 г. у Польшчы было 4,1 млн. праваслаўных, з іх 2 млн. украінцаў, 1,5 млн. беларусаў, 500 тыс. палякаў, 100 тыс. рускіх [3, с. 6; 4, с. 81]. Важную ролю ў наданні польскага характару самой праваслаўнай царкве іграла моўная праблема. Руская мова і паводле традыцыі, і з-за перавагі рускіх у складзе свяшчэннікаў, выхаваных яшчэ ў дарэвалюцыйнай Расійскай імперыі, працягвала выкарыстоўвацца як ва ўзаемаадносінах праваслаўных, так і ў царкоўным жыцці. Аднак у сярэдзіне 1930-х гг. усё больш фарсіраваўся працэс яе выцяснення з царкоўнага жыцця, пачаліся богаслужэнні на польскай мове. Першыя з іх адбыліся 11 лістапада 1935 г. у кафедральным саборы ў Беластоку і гарнізоннай царкве ў Гродна. Надзвычайны Сінод зацвердзіў пераклады літургічных тэкстаў і дазволіў праводзіць набажэнствы па-польску. Прыхільнікам паланізацыі царкоўнага жыцця быў гродзенскі епіскап Сава. Пашырэннем польскасці сярод беларускага насельніцтва пачалі займацца маладыя святары, выпускнікі Віленскай семінарыі і тэалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта. Паводле закона аб адносінах Польскай дзяржавы з аўтакефальнай праваслаўнай царквой, афіцыйнай мовай духоўных улад стала польская [1, с. 175]. З 1938 г. польская адміністрацыя настойліва патрабавала рабіць казанні ў цэрквах на польскай мове. Вялікае значэнне надавалася ўдзелу праваслаўных свяшчэннікаў у розных дзяржаўных святочных мерапрыемствах.

Дзеянні па ўзмацненню паланізацыі праваслаўнай царквы суправаджаліся чарговым (трэцім) этапам рэвіндыкацыі пры ўдзеле войска, які прыходзіўся на 1937–1939 гг. У ходзе гвалтоўнай акцыі ў гэты перыяд на Холмшчыне, Падляшшы, у Люблінскім ваяводстве было разбурана 127 праваслаўных культавых пабудоў [5, с. 102]. Аналагічныя разбурэнні цэркваў і капліц адбываліся на Валыні. Хоць у заходнебеларускіх землях рэвіндыкацыйная кампанія ўжо не мела такіх памераў і агідных форм (гэта назіралася там яшчэ ў 1920-я – пачатку 1930-х гг.), аднак працягвала

выкарыстоўвацца ў палітыцы польскіх улад [6]. Рэвіндыкацыя пазбавіла праваслаўнае духавенства матэрыяльнай самастойнасці і ставіла яго ў большую залежнасць ад дзяржаўных датацый [5, с. 102; 7, с. 16].

Адначасова польскія ўлады інспіравалі рух «праваслаўных палякаў» (яго даследаваннем грунтоўна займаўся В. Чарапіца [8–9]). У якасці фармальнай падставы выкарыстоўвалася наяўнасць пэўнай часткі польскамоўных праваслаўных [10]. Частку актывістаў новага грамадскага руху складалі чыноўнікі праваслаўнага веравызнання. У 1935 г. у Беластоку ўзнікла таварыства «Праваслаўны дом» імя Ю. Пілсудскага. Як адзначаў яго старшыня П. Ярчак ў адным з лістоў у міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы, «варожыя Польшчы элементы і старое даваеннае праваслаўнае духавенства, непадрыхтаванае да новага дзяржаўнага ладу і культурнага развіцця», займалася русіфікацыяй [11, арк. 1]. Для «усведамлення, уздыму культуры, асветы, маральнасці» пэўнай групы «праваслаўных людзей польскай нацыянальнасці» рабіліся запыты адносна субсідый для арганізацыі святкаванняў і падарункаў, выдання польскамоўнай «Праваслаўнай газеты». «Варожая руская прэса – «Русское слово», «Наше время», «Новая искра», якія выдаюцца ў Вільні, а таксама аддзелы Рускага дабрачыннага таварыства сваёй прапагандай з удзелам праваслаўнага духавенства не толькі шкодзяць дзяржаве, але і калечаць праваслаўны народ». Рэзюмэ гэтага ліста нагадвала своеасаблівы данос: «Гэтаму трэба палажыць канец!» [11, арк. 3–4].

Аналагічныя таварыствы «праваслаўных палякаў» былі створаны ў Гродна, Вільні, Навагрудку, Валожыне, Слоніме, Баранавічах [12]. На іх арганізацыйных сходах рабіліся заклікі аб барацьбе з «наступствамі царскай русіфікацыі» [13]. Акрамя аб'яднання і салідарнасці, мэтамі таварыства «Дом палякаў праваслаўнага веравызнання імя С. Баторыя» ў Гродна абвяшчаліся таксама «прапаганда сярод членаў таварыства асноў выхавання дзяцей добрымі грамадзянамі Польскай Рэспублікі; апека над дзецьмі (догляд дзяцей, утварэнне летніх лагераў, экскурсіі і г.д.)» [14, арк. 1]. У Гродна працаваў Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут, мэтай якога з'яўлялася «арганізацыя навуковай і выдавецкай дзейнасці для паглыблення і пашырэння сярод праваслаўнага духавенства і вернікаў асноў Святой Веры, Святога Пісьма, а таксама канонаў праваслаўнай царквы, яе арганізацыі і гісторыі, з асаблівым улікам гісторыі і становішча праваслаўнай царквы ў Польшчы» [14, арк. 20]. Там друкавалі па-польску часопіс «Голас праваслаўя», брашуры. Установа ажыццяўляла сваю выдавецкую, навукова-прпагандысцкую дзейнасць выключна за кошт субсідый урада і мясцовых органаў улады. Так, на 1939/1940 г. у каштарысе Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута з агульнай сумы запланаваных прыбыткаў (73 390 злотых) большасць адводзілася на субсідыі

міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы (50 670 злотых), частку выдаткаў пагадзілася пакрыць міністэрства вайсковых спраў [15, с. 65–66, 77–78].

Меры ў напрамку паланізацыі праваслаўнай царквы ў другой палове 1930-х гг. распрацоўваліся як на ўрадавым узроўні, так і ваяводскімі ўладамі і з'яўляліся састаўной часткай планаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва і ўмацавання пазіцый польскай культуры. Адначасова адбывалася не толькі ідэалагічнае абгрунтаванне, але і практычнае паўсядзённае выкарыстанне структур праваслаўнай царквы ў якасці інструмента паланізацыі беларускага насельніцтва [16, с. 271].

Летам 1937 г. навагрудскі ваявода А. Сакалоўскі прадставіў на з'ездзе павятовых стараст дакумент «Актывізацыя польскага элементу» [17, арк. 36–47]. Ад праваслаўных святароў патрабаваўся актыўны ўдзел у паланізацыі вернікаў прыходаў (паводле афіцыйных звестак, у 1931 г. у Навагрудскім ваяводстве праваслаўныя складалі 49% [18, арк. 34–35 адв.]). У адной са справаздач навагрудскага ваяводы адзначалася, што «большасць праваслаўнага клеру – гэта людзі старэйшага пакалення, прасякнутыя рускім духам і культурай, выразна нацэленыя на былую нацыянальную Расію» [18, арк. 34 адв.]. Сцвярджалася, што шляхам пераводаў часткі праваслаўных святароў, іншымі захадамі мясцовай адміністрацыі ўдалося дабіцца, каб каля 70% праваслаўнага духавенства Навагрудскага ваяводства перайшло да выкладання рэлігіі ў пачатковых школах па-польску. Для паскарэння паланізацыі праваслаўнай царквы прапаноўвалася духоўным уладам неадкладна прыступіць да прызначэння благачыннымі маладых святароў з адпаведнай тэалагічнай падрыхтоўкай, а таксама старэйшых прадстаўнікоў, якія паказалі лаяльныя адносіны да ўлад, падтрымлівалі паланізацыю праваслаўнай царквы. Усе кадравыя прызначэнні царкоўныя ўлады павінны былі ўзгадняць з ваяводай [18, арк. 35 адв.].

Агульныя дырэктывы рэлігійнай палітыкі Польскай дзяржавы былі выкладзены міністрам веравызнанняў і грамадскай асветы В. Свента-слаўскім у разасланым 21 снежня 1938 г. усім ваяводам лісце «Рэлігійная палітыка са спецыяльным разглядам праваслаўнай праблемы» [18, арк. 12–16]. У пералік асноўных пытанняў былі ўключаны дэрусіфікацыя, барацьба з беларускім і ўкраінскім рухам, выключэнне рускай мовы з навучання рэлігіі ў школах, казанняў у цэрквах. «З усялякай беларускай нацыя-налістычнай агітацыяй у любой форме трэба сурова змагацца… Трэба імкнуцца да запавольвання экспансіі ўкраінскага нацыяналізму» [18, арк. 14–14 адв.]. Было дадзена ўказанне наконт адносін да місіянерскай

дзейнасці каталіцкага касцёла візантыйска-славянскага абраду – «захоўваць ранейшае адмоўнае стаўленне» [18, арк. 15].

У пачатку 1939 г. дырэктар дэпартамента веравызнанняў міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Г. Баркоўскі заявіў у Брэсце аб безумоўнай паланізацыі праваслаўных жыхароў Віленскага, Палескага, Беластоцкага ваяводстваў. «Палітыка адносна праваслаўнай царквы нацэлена на поўную дзяржаўную асіміляцыю праваслаўнага насельніцтва і ўсемагчымае ўзмацненне экспансіі польскай культуры» [19].

Адміністрацыя Палескага ваяводства, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва (у студзені 1939 г. праваслаўныя складалі 77,76% жыхароў [18, арк. 30]), асабліва была занепакоена якасным складам корпусу святароў. «Невялікі працэнт вышэйшай духоўнай іерархіі на чале з епіскапам Аляксандрам, якая мае рускае паходжанне і адукацыю царскага часу, да польскай рэчаіснасці адносіцца з апартунізмам» [18, арк. 32]. У маі 1939 г. Палескае ваяводскае ўпраўленне прапанавала цэлы комплекс мер па ўзмацненню польскага ўплыву ў розных сферах грамадскага жыцця. Фактычна прадугледжвалася істотная паланізацыя праваслаўнай царквы. «Праваслаўная маса на Палессі ў палітычных, нацыянальных адносінах уяўляе сабой неапрацаваны і наогул падатлівы элемент для польскай дзяржаўнай асіміляцыі» [20, с. 28]. Сярод канкрэтных прапаноў былі патрабаванні аб спыненні адміністрацыйнымі мерамі неауніяцкай акцыі, адкрыцці духоўнай семінарыі і школы псаломшчыкаў у Пінску, дзе мясцовых кандыдатаў неабходна было «вучыць і выхоўваць у польскім духу», націск на праваслаўных іерархаў адносна выдання Сінодам ці мітрапалітам рашэння аб увядзенні ў праваслаўнай царкве грыгарыянскага календара [20, с. 83, 98]. Апошнюю праблему спрабавалі вырашыць яшчэ з пачатку 1920-х гг. Аднак у свядомасці праваслаўных вернікаў пераход на грыгарыянскі каляндар, які з'яўляўся сімвалічным адлюстраваннем адметнасці і глыбокай праваслаўнай традыцыі [21, с. 233], успрымаўся як грубае ўмяшальніцтва ў праваслаўнае веравучэнне. Мітрапаліт Дыянісій вымушаны быў прыняць 8 верасня 1924 г. кампраміснае па свайму характару распараджэнне – дапускалася выкарыстанне адразу двух календароў. У заходнебеларускіх прыходах па-ранейшаму прытрымліваліся юліянскага календара, у дзяржаўных установах, войску, школах быў уведзены грыгарыянскі календар. У канцы 1930-х гг. палескі ваявода В. Костэк-Бернацкі патрабаваў ад павятовых старастаў, каб яны паспрыялі падрыхтоўцы з боку розных сельскагаспадарчых гурткоў, аддзелаў пажарнай аховы, Стралецкага саюза і іншых грамадскіх арганізацый адпаведных петыцый аб пераходзе на грыгарыянскі каляндар [22, арк. 2]. Паводле ацэнак польскіх улад, у 1939 г. у Палескім ваяводстве ўжо ва ўсіх школах

навучанне рэлігіі адбывалася на польскай мове, казанні ў цэрквах таксама праводзіліся па-польску. Аднак на самой справе – на ламанай польскай мове, бо свяшчэннікі не ведалі яе дасканала ці не ведалі наогул [23, арк. 9–10]. Існуючая практыка складвання бацькамі школьнікаў двух экзэмпляраў (для царквы і школы) заявы аб мове навучання рэлігіі вяла да таго, што значная частка іх публічна не дэкларавала свае нацыянальныя (моўныя) інтарэсы, каб не мець непажаданых наступстваў. У Пінскай епархіі афіцыйнае справаводства праводзілася па-польску. Толькі ў тых прыходах, дзе вернікі старэйшага ўзросту не ведалі польскай мовы, дапускалася мясцовая, палеская гаворка. Украінская і беларуская мовы не дазваляліся [20, с. 29; 24, арк. 27].

Большасць праваслаўных свяшчэннікаў негатыўна ці стрымана рэагавала на планы паланізацыі праваслаўнай царквы. Дзеля самазахавання духавенства вымушана было знешне захоўваць палітычную лаяльнасць адносна Польскай дзяржавы. Па ініцыятыве палескага ваяводы В. Костэк-Бернацкага свяшчэннікі павінны былі падпісвацца пад пісьмовай прысягай аб лаяльнасці і паслухмянасці адносна дзяржаўнай адміністрацыі [25, арк. 43].

У Беластоцкім ваяводстве, дзе праваслаўнае насельніцтва размяшчалася ва ўсходняй частцы (пераважна ў Ваўкавыскім, Гродзенскім, Бельскім, Беластоцкім і Саколкаўскім паветах), на працягу ўсяго міжваеннага часу таксама распрацоўваліся планы паланізацыі праваслаўнай царквы [26]. Канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтым напрамку былі выпрацаваны Беластоцкім ваяводскім упраўленнем у канцы 1930-х гг. Як сведчыць асобны рэферат беластоцкага ваяводы, накіраваны 3 чэрвеня 1939 г. у МУС Польшчы, са 120 праваслаўных свяшчэннікаў на тэрыторыі Ваўкавыскага, Гродзенскага, Бельскага, Беластоцкага і Саколкаўскага паветаў 56 дэкларавалі сябе палякамі, 37 – беларусамі, 8 – рускімі, 18 – украінцамі, 1 – латышом [27, арк. 27]. Сярод шэрагу прапаноў па ўзмацненню паланізацыі беластоцкі ваявода прапаноўваў наступныя: 1) правесці грунтоўную праверку грамадзянства ва ўсіх рускіх, якія прыбылі ў Польшчу пасля 1918 г., а тых, што «перашкаджаюць працэсам асіміляцыі», пазбавіць грамадзянства і выселіць па-за межы дзяржавы; імкнуцца да рашучага ўвядзення толькі польскай мовы ў навучанне рэлігіі, пропаведзі і ва ўсё царкоўнае жыццё; 3) «пастаянна і рашуча выдаляць з пасад свяшчэннікаў праваслаўнай царквы людзей, прасякнутых рускім духам і культурай, а на іх месца прызначаць адзінкі, выхаваныя ў польскім духу і адданыя польскай справе»; 4) падтрымаць таварыствы «праваслаўных палякаў», Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут, дзейнасць якіх павінна прывесці «да выгнання рускага ўплыву з праваслаўнай царквы і яе паланізацыі» [27, арк. 145].

У цэлым у канцы 1930-х гг. польскія дзяржаўныя ўлады значна актывізавалі дзеянні ў напрамку надання праваслаўнай царкве польскага характару і адначасова па пераўтварэнню яе ў дзейсны сацыяльны інстытут па нацыянальна-культурнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва. Рэалізацыя такіх планаў на практыцы адмоўна адбівалася на захаванні праваслаўнай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны і магла ў бліжэйшай перспектыве прывесці да большых незваротных негатыўных наступстваў і страт.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Krasowski, K. Związki wyznaniowe w II Rzeczypospolitej : studium historycznoprawne / K. Krasowski. – Warszawa ; Poznań : PWN, 1988. – 355 s.

2. Chojnowski, A. Koncepcje polityki narodowościowej rządow polskich w latach 1921–1939 / A. Chojnowski. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków : Ossolineum, 1979. – 262 s.

3. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zespół 322. – Sygnatura 2870.

4. Zabrodzki, B. Liczba i rozmieszczenie mieszkańców Polski według języka i wyznań / B. Zabrodzki // Sprawy narodowościowe. – 1937. – № 1–2.

5. Mironowicz, A. Rewindykacja prawosławnych obiektów sakralnych w II Rzeczypospolitej / A. Mironowicz // Białoruskie zeszyty historyczne.– Białystok : Białoruskie towarzystwo historyczne, 2004. – № 21. – S. 83–103.

6. Загідулін, А. М. Кампаніі рэвіндыкацыі як элемент палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі (1918–1939) / А. М. Загідулін // Веснік Гродзен. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Серыя 1, Гуманітарныя навукі. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 18–26.

7. Загідулін, А. М. Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гістар. навук : 07.00.02 / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск : [б. в.], 2005. – 20 с.

8. Черепица, В. Н. «Православные поляки» на Гродненщине (1934–1939 гг.) / В. Н. Черепица // 60-летие образования Гродненской области : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 3–4 марта 2004 г. / отв. ред. В. А. Белозорович. – Гродно : ГрГУ, 2004. – С. 123–133.

9. Черепица, В. Н. Очерки истории православной церкви на Гродненщине (С древнейших времен до наших дней) : монография : в 2 ч. / В. Н. Черепица. – Гродно : ГрГУ, 2005. – Ч. 2. – 439 с.

10. Czarnowski, O. Polacy prawosławni w Polsce / O. Czarnowski // Sprawy narodowościowe. – 1929. – № 3. – S. 454–478.

11. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 92. – Воп. 1. – Спр. 2.

12. AAN. – Zespół 8. – Cz. VI. – Sygnatura 148–263.

13. ДАГВ. – Ф. 92. – Воп. 1. – Спр. 3.

14. ДАГВ. – Ф. 92. – Воп. 1. – Спр. 1.

15. AAN. – Zespół 14. – Sygnatura 1253.

16. Mironowicz, E. Białorusini i Ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego / E. Mironowicz. – Białystok : Trans Humana, 2007. – 293 s.

17. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1281.

18. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2305.

19. Mironowicz, A. Problematyka narodowościowa w kościele prawosławnym w II Rzeczypospolitej // W Kręgu sacrum i pagranicza / Wydział Historyczne-Socjologiczny Uniwersytetu w Białymstoku, Instytut Socjologji ; pod red. E. Matuszczyk i M. Krzywosza. – Białystok : Offset-Print, 2004. – S. 271–286.

20. Polski stan posiadania na Polesiu. – Brześć nad Bugiem : [b. w.], 1939. – 110 s.

21. Papierzyńska-Turek, M. Między tradycją a rzeczywistością: Państwo wobec prawosławia 1918–1939 / M. Papierzyńska-Turek. – Warszawa : PWN, 1989. – 484 s.

22. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2088.

23. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2316.

24. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2358.

25. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2331.

26. Kalina, M. Polonizacja Cerkwi prawosławnej w województwie białostockim (1918–1939) / M. Kalina // Białoruskie zeszyty historyczne.– Białystok : Białoruskie towarzystwo historyczne. – 1995. – № 2 (4). – S. 74–105.

27. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1574.

УДК 27 "15/16"

**Д.Н. Савич (Витебск)**

## ПЕРЕПИСКА УНИАТСКОГО АРХИЕПИСКОПА ПОЛОЦКОГО ИОСАФАТА КУНЦЕВИЧА КАК МАТЕРИАЛ ДЛЯ КОНФЕССИОНАЛЬНОЙ ИСТОРИИ г. ВИТЕБСКА НАЧАЛА XVI в.

На протяжении XVII в. территория современной Витебской епархии находилась в управлении Полоцкого архиепископа, а с 1620 г. входила в состав Мстиславской православной епархии. В истории православной церкви на белорусской земле Витебский край занимает особое место, где